# ІНСТЫТУТ ВЯЛІКАГА КНЯЗЯ: ПАХОДЖАННЕ, СУТНАСЦЬ, ПРАВАВОЕ СТАНОВІШЧА НА ПАЧАТКОВЫМ ЭТАПЕ

*Міськевіч А. Ю.*

Вывучэнне гісторыі дзяржаўных структур улады і разумення дзеяння ўсяго дзяржаўнага механізма дапамагае засвоіць прынцыпы дзеяння дзяржаўнага апарату і забяспечыць падрыхтоўку свядомых будаўнікоў свабоднага грамадства. Гістарычны аналіз такога прававога инстытута, як Вялікі князь, неабходны для правільнага ўсведамлення сутнасці такіх інстытутаў, як кароль, прэзідэнт. Без ведання працейшых форм дзяржаўнага кіравання цяжка засвоіць сутнасць сучасных, складаных сістэм дзяржаўнай улады і кіравання.

Тэрмін “Вялікі князь” найбольш вядомы нам з гісторыі Рускай дзяржавы і Вялікага княства Літоўскага. У якасці першага Вялікага князя Кіеўскага ўзгадваецца князь Алег (русско-візантійскій договор 911 г.) [1, с. 17]. Паводле Вялікай савецкай энцыклапедыі, на Русі пад Вялікім князем разумелі кіраўніка незалежнай дзяржавы, які лічыўся старэйшым з усіх князёў, якія кіравалі ўдзельнымі княствамі. Пазней, тытул Вялікага князя мелі права насіць князі, якія атрымалі ярлык на княжанне ад татарскага хана. Такім чынам, на Русі Вялікі князь з’яўляўся сюзерэнам, якому падпарадкаваны іншыя князі – яго васалы. Крыху іншае значэнне набыў гэты тэрмін у Літве.

Калі прымяняць рускае азначэнне тэрміну Вялікі князь, то шэраг князёў Вялікага княства Літоўскага пазбавяцца гэтага тытулу. У такім выпадку паўнапраўна можна лічыць Вялікімі князямі кіраўнікоў Літва пачынаючы толькі з Віценя, пры якім да Літвы далучылася Полаччына – першая аўтаномная адзінка. Але гістарыяграфія прылічае да Вялікіх князёў Літоўскіх кіраўнікоў дзяржавы пачынаючы з Міндоўга (“у адным лісце Папы Рымскага, менавіта буле да куронскага і эзэльскага біскупаў, дзе гаворка ідзе пра арганізацыю каранацыі Міндоўга, ужыты тытул “superfaciemregem Luthawiae”. Фрыдрых Бунге, які апублікаваў названую булу, перакладае гэты выраз як (“убиша князя велика Миндовга”) [2, с. 203]), а некаторыя крыніцы нават напаўміфічных Рынгольда і Даўспрунка. Напрошваецца выснова, што дадатак “Вялікі” акрэсліваў у Літоўскай традыцыі не толькі юрыдычны сатус вярхоўнага сюзерэна, але і ставіў мэтай падкрэсліць магутнасць і высакароднасць носьбіта гэтага тытулу.

Можна вызначыць наступныя фактары, якія паўплывалі на асаблівасці статусу Вялікага князя ў Літве. Па-першае, гэта палітычная адсталасць Заходнебеларусіх зямель. Калі ў Польшчы, на Русі, Полаччыне дзяржаваўтварэнне адбывалася найпазней ў IX – X стст., то ў Панямонні гэты працэс адклаўся ажно да XIII ст. Безумоўна, пры пабудове дзяржавы літоўцы ўлічвалі досвед шматлікіх суседзяў, у краях якіх ім давялося пабываць ці то ў якасці падарожнікаў, ці нават ваеннапалонных. Па-другое, абсалютысцкі манархічны лад раннелітоўскай дзяржавы не мог не абумовіць выключна пашанныя адносіны да князя. Дадатак “Вялікі” быў як нельга дарэчы ў дзяржаве, дзе князь дасягнуў неабмежаванай улады. Калі да гэтага дадаць яшчэ і палітычныя поспехі першых князёў, то

Polotsk.SU

асаблівая цырыманіяльнасць у дачыненнях да манарха з’яўляецца цалкам натуральнай. Па-трэцяе, нельга не ўлічваць, што пануючай рэлігіяй першапачаткова ў Літве з’яўлялася язычніцтва. Як апісвае В.Л. Насевіч, “… кожны кунігас – гэта адначасова прадстаўнік племені перад тварам багоў, увасабленне іх магічнай моцы. Ад яго паводзін залежыць урадлівасць палёў і ўвогуле нязменнасць традыцыйнага ладу жыцця. Гэтая функцыя хрысціянскімі правіцелямі Русі ўжо практычна страчана, тут жа яна яшчэ захоўваецца…”

Тытул “Вялікі князь” мог быць як запазычаным з Кіеўскай Русі ці іншай суседняй дзяржавы, так і быць уласна літоўскім, г. зн. узнікшым непасрэдна ў Літве. Першым гістарычна вядомым Вялікім князем лічыцца рускі князь Алег [1, с.17]. Доўгі час гэты тытул замацоўваўся выключна за князямі Кіеўскімі. Але, пачынаючы з XII ст. гэты тытул набываюць шэраг кіраўнікоў дзяржаў (Чарнігаўскай, Галіцкай, Разанскай, Уладзімерскай), якія адасобіліся падчас феадальнай раздробленасці. Адносіны паміж Вялікім князем і ўдзельнымі князямі ці намеснікамі будаваліся па прынцыпе сюзерэнітэту-вассалітэту.

Найбольш ранняе ўпамінанне падобнага тытулу можна знайсці ў апісаннях грамадскага і палітычнага ладу палабскіх славян, застаўленых нямецкімі хранistamі. У гэтых хроніках упамінаюцца вярхоўныя кіраўнікі племянных саюзаў люцічаў, лужычан і абадрытаў. Адзначаецца, што пляменамі кіравалі часцей за ўсё сходы (веча). Але часта таксама ўпамінаюцца і аднаасобныя кіраўнікі – князі. Існавалі таксама асобы, якія кіравалі племяннымі саюзамі. Пры гэтым называюцца гэтыя пасады па-рознаму: у сербаў – галоўны князь; у люцічаў – Вялікі князь; у абадрытаў – кароль (ці таксама князь, у залежнасці ад перакладу (напрыклад, Дражко ўпамінаецца як “вярхоўны князь обадрытскага саюзу плямёнаў у 795 – 809 гг.” [3, с. 297]). Так, славянскі тытул “князь” (кънезь, от германского kuning) засведчаны ў абадрытаў ужо ў 882 годзе (Ann. S. Ganuti, 828; chnese). Найбольш магутныя з гэтых князёў, якім удавалася падпарадкаваць сабе іншых, больш слабых, станавіліся вялікімі князямі ці, нават, каралямі цэлых груп народаў. Праўда, такіх князёў можна сустрэць толькі перыядычна. Імі былі, напрыклад, Мілідух у сербаў (“rex superbus, qui regnabat in Siurbis”, Chron. Moiss., 806), а таксама Драгавіт (Другавіт) у 789 годзе ў велетаў, пра якога Эйнхард піша: “Dragavitus, rex... ceteris Wiltzorum regulis et nobilitate generis et auctoritate senectutis longe proeminebat” [4, с. 94].

Улічваючы, што і першыя князі рускія – Рурык, Алег, і першы князь літоўскі Міндоўг, не былі карэннымі жыхарамі сваіх дзяржаў, вельмі магчыма, што тытул вялікага князя быў запазычана з нейкай іншай краіны. Пры гэтым у Літве тытул Вялікі князь набыў крыху іншае значэнне, у адрозненні ад старажытнарускіх і заходнеславянскіх вялікіх князёў. З галіцка-валынскага летапісу мы ведаем, што на 1219 год у пераддзяржаўнай Літве існавалі князі розных рангаў: старэйшыя і малодшыя. З гэтага ж летапісу мы даведваемся, што на пачатку 1260-х гг. Міндоўг дасягнуў неабмежаванай улады (“самодержечь бысть во всей земли Литовской”). У некаторых крыніцах узгадваецца безымянны бацька Міндоўга. Імя яго там не падаецца, а гаворыцца толькі, што ён быў [5, с. 146]. Пры гэтым, як лічыць А. Шаранда, тут маецца на ўвазе “звычайную ліслівасць, выкарыстаную

PolotskSU

ў звароце да магутнага ўладара, які іграў адную з галоўных роляў у Літве ў пачатку XIII ст." [6, с. 9]. Вядома таксама, што сваякі Міндоўга падчас шматлікіх войнаў загінулі і ён застаўся адзіным са старэйшых князёў. Такім чынам, дадатак "Вялікі" да тытулу "князь" меў сваёй мэтай паказаць значнасць, велічнасць і магутнасць кіраўніка Літоўскай дзяржавы. А значэнне "князя над князямі" гэты тытул набыў толькі пасля далучэння да Літвы напаўсамастойных ўдзельных княстваў.

Звычайна ў літаратуры Вялікі князь Літоўскі падаецца як абмежаваны манарх, які валодаў правам заканадаўчай ініцыятывы, а выканаўчую ўладу дзяліў з Панамірадай. Аднак пра такое прававое становішча Вялікага князя мы можам казаць найраней з XIV ст., а з усёй упэўненасцю толькі пасля выдання прывілеяў 1447 і 1492 гг. Да гэтага часу Вялікі князь валодаў шырокім колаў значных паўнамоцтваў. Мы ўжо ўзгадвалі, што паводле Валынскага летапісу, на пачатку 1260-х гг. Міндоўг дасягнуў неабмежаванай улады. Са зместу Галіцка-Валынскага летапісу, Хронікі Быхаўца, можна зрабіць вывады, што Літоўскія князі самастойна вырашалі пытанні знешняй палітыкі, вайны і міру, а самае галоўнае, адчужэння дзяржаўных тэрыторый. Улада князя істотна ўмацоўваецца праз наяўнасць у князя значных зямельных надзелаў на правах прыватнай уласнасці. Увогуле дзяржава першапачаткова ў ВКЛ атаясамліваецца як уласнасць князя, а дзяржаўная казна на першых этапах не аддзелена ад асабістай княжацкай маёмасці. Зыходзячы з гэтага можна ахарактарызаваць Вялікага князя Літоўскага ў XIII – XIV стст., як абсалютнага і неабмежаванага манарха. Існаванне абсалютызму ў перыяд фармавання ядра ВКЛ можна растлумачыць шматлікімі тэрытарыяльнымі спрэчкамі паміж новаўтворанай дзяржавай і ўжо існаваўшымі працяглы час суседнімі дзяржавамі. Безумоўна, як абсалютны манарх, Вялікі князь Літоўскі выконваў у дзяржаве большасць ключавых функцыяў, сярод якіх некалькі варта вылучыць.

Адной з галоўных функцый было, безумоўна, вызначэнне ўнутранай і знешняй палітыкі. Вялікі князь вёў міжнародныя справы, уступаў у саюзы, абвяшчаў вайну і заключаў мір, усталёўваў падаткі (даніну), вызначаў прававое становішча гарадоў і земляў. Можна меркаваць, што воля Вялікага князя ў гэты час мела сілу закона.

Цікава, што Вялікі князь у Літве меў права вырашаць пытанні тэрытарыяльнай цэласнасці дзяржавы. Так, вядомы прыклады, калі сын Міндоўга Войшалк ад імя бацькі перадаў старэйшаму сыну Данілы (князя Галіцкага) Раману Наваградак, а ад сябе самога – Слонім і Ваўкавыск. Сам жа Міндоўг у 1251 годзе, каб атрымаць падтрымку магістра інфляндскага ордэну, перадаў гэтаму ордэну Жамойць. З функцыямі знешняй палітыкі і тэрытарыяльнай цэласнасці цесна звязана ваенная функцыя літоўскага князя. Ён распараджаўся і асабіста кіраваў узброенымі сіламі дзяржавы.

Да 1250 года Літва была язычніцкім краем, а неафіцыйна і больш працяглы час. У язычніцкай дзяржаве, якая толькі яшчэ адышла ад стану ваеннай дэмакратыі функцыя правадыра і вярхоўнага жраца яшчэ не аддзелены. Ускоснае сведчанне таму можна знайсці ў аповесці пра князёў Міндоўга, Войшалка і Тройдзеня: "ён [Міндоўг, А.М.] таемна прыносіў ахвяры сваім багам: першаму Нанадзею, і Целявелю, і Дзіверкізу, заечаму богу, і Мідзяіну… Міндоўг багам сваім прыносіў ахвяры, целы мёртвых спальваў і адкрыта трымаўся свайго язычніцтва…" [7, с. 38]. Звесткі аб паганскіх культах літоўцаў да нашага часу дайшлі няшмат-

лікія. Але праводзячы аналогію з іншымі тагачаснымі палітычнымі ўтварэннямі язычнікаў, найбольш яскравым з якіх можна лічыць Люцічскі саюз, можна меркаваць аб становішчы жрацоў і правадыроў у тагачасным літоўскім грамадстве. Так, В.Д. Бадрухін піша, што "адпраўленне культа ўваходзіла ў кампетэнцыю жрацоў" [8, с. 77]. Прымаючы пад увагу, што Міндоўг прыносіў ахвяры багам, г.зн. адпраўляў культ, можна меркаваць, што Вялікі князь быў не толькі ваенным і палітычным кіраўніком, але і вяржоўным жрацом. З прыняццем Міндоўгам хросту (паводле розных крыніц каталіцкага ці праваслаўнага), Вялікі князь вырашае таксама пытанні дачыненняў з царквой. З усяго гэтага можна вылучыць яшчэ адну функцыю Вялікага князя – рэлігійную.

Падсумоўваючы выкладзеныя вышэй разважанні, хацелася б скарочана вылучыць атрыманыя **высновы**. Інстытут Вялікага князя наўрад ці з'яўляецца ўласнабеларускім. Хутчэй за ўсё ён быў запазычаны або з Кіеўскай Русі ці з утвораных на яе абломках самастойных княстваў, або ад заходніх палабскіх славян, якія мігравалі ў накірунку Чэхіі а таксама так званай Чорнай Русі пасля германскага заваявання іх тэрыторый. Пры гэтым у Літве тытул "Вялікі князь" набыў крыху іншае значэнне. У адрозненне ад іншых дзяржаў, ён першапачаткова не абазначаў кіраўніка федэратыўных тэрыторый (князя князёў), а меў сваёй мэтай падкрэсліць выключнае значэнне, магутнасць і велічнасць кіраўніка дзяржавы. Асноўнымі функцыямі Вялікіх князёў, папярэднікаў дынастыі Гедымінавічаў былі: вызначэнне ўнутранай і знешняй палітыкі; вырашэнне тэрытарыяльных і зямельных пытанняў (распараджэнне тэрыторыяй на карысць сваёй ці замежных дзяржаў, а таксама надзяленне зямлёй служылых людзей); ваенная функцыя; рэлігійная функцыя.

ЛІТАРАТУРА

1. Повесть временных лет. Ч. 1. Текст и перевод. – М.-Л., 1950. – 2-е изд., испр. и доп. – СПб., 1996. СПб., 1999 (по списку Лаврентьевской летописи; в примечаниях: ПВЛ 1999). – 351 с.
2. Краўцэвіч, А.К. Стварэнне Вялікага княства Літоўскага / А.К. Краўцэвіч. – Мінск: Беларус. навука, 1998. – 208 с.
3. Strzelczyk, J. Zapomniane narody Europy / J. Strzelczyk. – Wrocław, 2006. – 438 c.
4. Нидерле Любор / пер. с чешского Т. Ковалевой и М. Хазанова. Предисл. проф. П.Н. Третьякова; ред. А.Л. Монгайта. Славянские древности. (Rukovet slovanskych starozitnosti, 1953). – М.: Изд-во Иностр. лит.; ред. лит. по ист. наукам, 1956. – 680 с.
5. LivlandischeReimchronik / Her. von Leo Meyer. – Padeborn, 1876. – 311 c.
6. Шаланда, А. Паходжанне і лёс роду Міндоўга=The Origin and the destiny of Mindoŭhgens / А. Шаланда // Герольд Litherland. – Горадня, 2003. – № 1 – 2. – С. 9 – 10.
7. Беларускія летапісы і хронікі / склад. У. Арлоў; рэд. В. Чамярыцкі. – Мінск: Беларус. кнігазбор, 1997. – 432 с.
8. Бодрухин, В.Д. О роли языческих жрецов у лютичей / В.Н. Бодрухин // Вестн. Удмурт. гос. ун-та. – Ижевск, 2008. – № 2, вып. 2. – С. 71 – 80.
9. Галицко-Волынская летопись / пер. на совр. рус. яз. и ком. О.П. Лихачевой // Библ. лит. Древней Руси: в 20 т. – СПб., 1997. – Т. 5. – С. 184 – 357, 482 – 515.



PolotskSU